*Коваль В. У.*
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

*Koval V. U.*
Belarusian State Technological University, Minsk, Belarus

**УДК 378.662(476)(091)**

# ГІСТОРЫЯ ЎНІВЕРСІТЭТА Ў ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ

# UNIVERSITY HISTORY IN THE ADDITION EDUCATION FOR ADULTS

*У артыкуле аналізуецца выкарыстанне ўніверсітэцкай гісторыі пры дадатковай адукацыі дарослых. Аўтар вылучае адметную ролю ўніверсітэцкай навуковай спадчыны ў павышэнні прэстыжу нацыянальнай сістэмы адукацыі для сусветнай інтэлектуальнай супольнасці.*

*Ключавыя словы: гісторыя ўніверсітэта; дадатковая адукацыя; міжнароднае супрацоўніцтва; інтэлектуальная супольнасць.*

*The article proposes to use the university history in the process of the additional education for adults. The author highlights the exceptional role of the university scientific heritage in the increasing of the prestige for the national education system in the world intellectual community.*

*Key words: university history; addition education; international cooperation; intellectual community.*

Навуковая спадчына ўніверсітэта з’яўляецца адлюстраваннем гістарычных эпох, разуменне якіх дапамагае асобам у працэсе сацыялізацыі. Пры даследаванні мінулага беларускай вышэйшай школы падзеі і факты савецкай эпохі павінны супастаўляцца з сусветнымі тэндэнцыямі ў сістэме адукацыі, дапаўняцца замежным педагагічным вопытам. Дадатковае навучанне дарослых патрабуе больш шырокага вывучэння вядомых гістарычных фактаў, якія дазволяць скласці ўяўленні пра ролю нацыянальнай сістэмы адукацыі ў сусветнай інтэлектуальнай супольнасці.

Якасць і прэстыж беларускай вышэйшай школы непасрэдна залежыць ад прафесійнай кампетэнтнасці педагагічнага складу. Павышэнне ўзроўню прафесійнага майстэрства выкладчыкаў павінна адбывацца таксама ў рамках курсаў па гісторыі ўніверсітэта. Эфектыўнае развіццё сферы кіравання ўніверсітэта абапірацца на традыцыйныя, гістарычна сфарміраваныя ўмовы, у якіх развіваецца ўстанова адукацыі. Даследаванне мінулага дзяржавы праз гістарычныя факты развіцця ўніверсітэта дазволіць педагогам вылучыць асноўныя праблемы ўзаемадзеяння, дапамагчы сацыяльнай і прафесійнай адаптацыі студэнтаў, забяспечыць самарэалізацыю асобы ў калектыве.

Арганізацыя адукацыйных праграм па гісторыі ўстановы адукацыі ў форме лекцый, круглых сталоў і тэматычных семінараў дазволіць аказаць значны ўплыў на псіхалагічны клімат педагагічнага складу, закласці новыя ўніверсітэцкія традыцыі, аднавіць імёны таленавітых вучоных і педагогаў.

Сёння ў сістэме адукацыі зроблены акцэнт на якасці вынікаў навучання, калі выяўляецца здольнасць асобы аператыўна і якасна прымаць рашэнні ў розных праблемных сітуацыях [1, с. 42]. Менавіта такі кампетэнтнасны падыход патрабуе сучасных поглядаў на сістэму дадатковага навучання дарослых. Павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў павінна ажыццяўляцца ў рамках лекцыйных курсаў, накіраваных на развіццё камунікатыўных і інфармацыйных навыкаў асоб. Курс універсітэцкай гісторыі – выдатны прыклад праграм дадатковага навучання дарослых, у якіх могуць спалучацца музейныя заняткі і псіхалагічныя трэнінгі з лекцыямі па гісторыі.

Вывучэнне гісторыі беларускіх універсітэтаў адбываецца спецыялістамі, якія захоўваюць і пашыраюць музеі ўстаноў адукацыі, асобнымі педагогамі, што выкарыстоўваюць гістарычныя факты ў сваім вучэбна-выхаваўчым працэсе. Да чарговых юбілеяў універсітэцкія выдавецтвы імкнуцца падрыхтаваць даведнікі ці манаграфіі пра этапы станаўлення і развіцця ўстановы адукацыі.

Для эфектыўнага міжнароднага супрацоўніцтва, якое дазволіць замацаваць пазіцыі нацыянальнай сістэмы адукацыі ў сусветнай інтэлектуальнай супольнасці, неабходна вывучаць гісторыю ўніверсітэта ў кантэксце развіцця замежных адукацыйных і навуковых цэнтраў. На жаль, спецыялісты не закранаюць у поўнай ступені замежны вопыт супрацоўніцтва пры аналізе педагагічнай дзейнасці калектыва. Неабходна падкрэсліць, што вядомыя педагогі і выбітныя вучоныя мелі замежныя камандзіроўкі, пра іх лекцыі рэгулярна размяшчала матэрыялы замежная прэса, іх візіты дазвалялі арганізоўваюць абмен навуковай літаратурай і падручнікамі. Па прычыне дыскрымінацыйнай палітыкі польскіх улад у міжваенны перыяд значная колькасць моладзі з тэрыторыі Заходняй Беларусі набывала адукацыю за мяжой, а пасля вярталася на радзіму для рэалізацыі сябе ў прафесіі.

Асаблівасці даследавання гісторыі ўніверсітэта можна прасачыць па мінулым Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта ў кантэксце станаўлення лесаінжынернай справы Беларусі і ўдасканальвання лесатэхнічнай адукацыі. У 1930 г. у Гомеле быў заснаваны Беларускі лясны інстытут, які ў 1934 г. быў перайменаваны ў Беларускі лесатэхнічны інстытут (у 1935 г. інстытуту было прысвоена імя Сяргея Міронавіча Кірава). Неабходна падкрэсліць, што пытанням лясной гаспадаркі ў БССР надавалася асаблівае значэнне. У пратаколах Савета народных камісараў перыядычна ўздымаліся праблемы аптымізацыі лясной і хімічнай прамысловасці. Архіўныя фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, якія захоўваюць пратаколы Савета народных камісараў (СНК), сведчаць: «Лесахэмічная вытворчасьць БССР, складаючаяся з малакурана-шкіпінарных, ачысьціцельных, каніфольных і сьпірытуса-парашковых заводаў мае дастаткова грунтоўную базу і пэрспэктывы для свайго развіцьця, дзякуючы наліччу дастатковай базы сыравіны і вялікаму значэньню для

шэрагу галін буйнай прамысловасьці Саюзу і экспарту» [2, л. 28]. Актыўнае развіццё ў БССР сістэмы падрыхтоўкі тэхнічнай інтэлігенцыі яскрава сведчыць пра зацікаўленасць кіраўніцтва рэспублікі ў перспектыўных кадрах у галіне лясной і хімічнай прамысловасці.

Слаба распрацаванай тэмай з’яўляецца пытанне падрыхтоўкі беларускіх інжынераў за мяжой, якія пасля пасняхова рэалізоўваліся ў сваёй прафесіі на Бацькаўшчыне. Новыя аспекты даследавання станаўлення лесатэхнічнай справы могуць дапоўніць гісторыю беларускіх універсітэтаў. Факты міжнароднага супрацоўніцтва дазволяць у сучасных умовах эфектыўна развіваць кантакты з замежнымі навучальнымі ўстановамі ў рамках праграм дадатковага навучання дарослых, арганізоўваюць стажыроўкі, курсы, «летнія школы».

Асабліва падрабязна неабходна даследаваць міжваенны перыяд, калі беларуская моладзь была вымушана жыць у эміграцыі з мэтай атрымання вышэйшай адукацыі. З 1921 па 1939 г. тэрыторыя Заходняй Беларусі з’яўлялася часткай Польшчы, дзе стаўленне ўлад да нацыянальных меншасцей было несправядлівым. Можна грунтоўна абаснаваць дыскрымінацыйную палітыку польскіх улад у галіне адукацыі, калі беларусы ў Польшчы не мелі магчымасці атрымаць вышэйшую адукацыю, ствараліся штучныя перашкоды для нацыянальных меншасцей пры паступленні ва ўніверсітэты.

Адным з асноўных адукацыйных цэнтраў беларусаў замежжа у міжваенны перыяд стала Чэхаславакія, дзе ўрад краіны з 1921 г. ажыццяўляў спецыяльную праграму падтрымкі эмігрантаў з былой Расійскай імперыі пад назвай «Руская акцыя дапамогі». Беларускіх вышэйшых навучальных устаноў у Чэхаславакіі не было, хаця ідэя адкрыцця нацыянальнага ўніверсітэта ў Празе абмяркоўвалася неаднаразова. Большая частка беларускай моладзі атрымоўвала адукацыю ў Карлавым універсітэце і Чэшскім вышэйшым тэхнічным вучылішчы (Пражская палітэхніка). Акрамя Прагі беларускія студэнты вучыліся ў Падэбрадах, Браціславе, Брно. Частка беларусаў набывала адукацыю ў рускіх і ўкраінскіх універсітэтах і інстытутах, створаных у Чэхаславакіі ў рамках праграмы «Руская акцыя дапамогі». Беларуская моладзь пасля атрымання дыплома імкнулася вярнуцца ў Заходнюю Беларусь, каб рэалізавацца на радзіме ў якасці спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.

Сучасныя архіўныя дакументы дазваляюць аднавіць спісы студэнцкіх груп, на аснове якіх можна скласці агульную карціну найбольш запатрабаваных спецыяльнасцей для беларускіх эмігрантаў. Студэнты-беларусы набывалі педагагічныя спецыяльнасці, яны вучыліся на медыцынскім факультэце Карлавага ўніверсітэта, набывалі адукацыю ў Пражскай палітэхніцы, імкнуліся стаць інжынерамі. Працэс навучання ў чэшскіх вышэйшых установах адбываўся на чэшскай мове, што стварала дадатковыя цяжкасці для замежных студэнтаў. Моўны бар’ер складаней было

пераадолець студэнтам гуманітарных спецыяльнасцей. Будучыя інжынеры прасцей спраўляліся з праблемай слабой моўнай падрыхтоўкі, што дазваляла ім хутчэй прайсці перыяд першапачатковай сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі ў чэшскім грамадстве. Беларуская моладзь сярод інжынерных спецыяльнасцей выбірала запатрабаваную ў Заходняй Беларусі прафесію – інжынер лясной гаспадаркі. Беларускія эмігранты ў Чэхаславакіі таксама імкнуліся стаць хімікамі-тэхнолагамі, інжынерамі-аграномамі, інжынерамі-гідратэхнікамі, інжынерамі-эканамістамі. Пералічаныя запатрабаваныя спецыяльнасці беларусам прапаноўвала Украінская гаспадарчая акадэмія ў Падэбрадах, дзе навучанне адбывалася на ўкраінскай мове. Ва Украінскай гаспадарчай акадэміі адным з асноўных было лясное аддзяленне, якое рыхтавала інжынераў лясной гаспадаркі.

Беларуская дыяспара ў Чэхаславакіі развівала сваю грамадскую актыўнасць, эмігранты аб'ядноўваліся ў саюзы, гурткі і таварыствы. Студэнцкая моладзь з ліку будучых інжынераў стварыла Грамаду ўкраінскіх і беларускіх студэнтаў лясной інжынерыі ў Празе. Захавалася выява пячаткі грамадскай арганізацыі інжынераў [3, с. 66], што дазваляе рабіць высновы пра легальную рэгістрацыю Грамады ў Чэхаславакіі.

Такім чынам, выкарыстанне ўніверсітэцкай гісторыі пры дадатковай адукацыі дарослых павінна пашыраць прафесійныя кампетэнцыі выкладчыкаў, садзейнічаць эфектыўнасці развіцця міжнародных кантактаў, ствараць станоўчы псіхалагічны клімат у калектыве, фарміраваць новыя ацэнкі і традыцыі навуковай спадчыны. Папулярызацыя гісторыі беларускіх універсітэтаў дазволіць узняць прэстыж нацыянальнай сістэмы адукацыі ў сусветнай інтэлектуальнай супольнасці. У даследаванні гісторыі лясной гаспадаркі новыя погляды на тэму дазволяць шырэй прадставіць беларускую гісторыю падрыхтоўкі інжынераў, пераасэнсаваць ролю міжнародных студэнцкіх ініцыятыў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Краско, И. В.* Адаптация системы образования к трансформации рынка труда / И. В. Краско // Высшая школа: проблемы и перспективы: сб. материалов XIV Междунар. науч.-метод. конф., Минск, 29 нояб. 2019 г. – Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2019. – С. 41–43.

2. НАРБ (Национальный архив Республики Беларусь). – Фонд 7. Совет народных комиссаров (Совнарком, СНК) БССР. – Оп. 1. – Д. 802. Протоколы заседаний СНК БССР и ЭКОСО БССР за 1930 г.

3. *Наріжний, С.* Українська еміграція. Культурна праця української еміграції між двома світовими війнами / С. Наріжний. – Львів; Кент; Острог: НТШ, 2008. – 367 с.